# Сярод лаўрэатаў – двое пастаўчан

стар. 1

Анна Анішкевіч



Учора ў Віцебску адбылося ўшанаванне лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2023».

## Не саступае лідарства

Перасесці з аўтамабіля на корманарыхтоўчы камбайн нямецкай вытворчасці Юрыю Гваздову кіраўніцтва гаспадаркі прапанавала больш за чвэрць стагоддзя таму. Малады механізатар згадзіўся. І ўжо ў першы ж год працы на ім дабіўся высокай выпрацоўкі, абышоўшы больш вопытных калег. З таго часу лідарства не саступае нікому нават у вобласці.

*— Дзесьці праз пяць гадоў гаспадарка купіла новы «Ягуар» і замацавала за мной,* — успамінае Юрый. — *Вадзіцельскае пасведчанне я атрымаў яшчэ ў школе, затым вывучыўся на токара і слесара, таму камбайн заўсёды рамантую сам. Немалаважным у рабоце з'яўляецца і тое, што люблю сваю прафесію, дасканала ведаю ўстройства тэхнікі. Нездарма на тым «Ягуары» адпрацаваў амаль два дзесяцігоддзі. Ён і цяпер задзейнічаны на нарыхтоўцы кармоў. А я ўжо трэці год кірую новым.*

Летась Юрый Гваздоў нарыхтаваў 25 622 тоны травяной масы на сянаж і сілас, накасіў і здрабніў 6 370 тон травы, падабраў для закладкі сенажу 8 640 тон зялёнай масы, нарыхтаваў 15 870 тон кукурузы на кармы і сілас. І ў чарговы раз стаў лідарам на корманарыхтоўцы сярод механізатараў вобласці.



●*Механізатар ААТ «Навасёлкі-Лучай» Юрый Гваздоў за штурвалам камбайна*

*У мінулым годзе ў ліку 23 работнікаў аграпрамысловага комплексу Беларусі я быў узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». А сёлета прысвоена такое высокае званне. Вядома ж, ганарова. Але заўсёды кажу: мае поспехі — заслуга не толькі мая. Каб вырасла добрая кукуруза, аграному трэба падабраць поле пад яе, кіраўніцтву гаспадаркі — набыць высокаўраджайныя сарты насення, удабрэнні і хімікаты, механізатарам — якасна падрыхтаваць глебу, пасеяць. Затым пасевы неабходна своечасова падкарміць, апрацаваць ад шкоднікаў... Я ж убіраю вырашчанае. Прыемна, што ў нашай краіне не абдзяляюць увагай работнікаў аграпрамысловага комплексу.*